З вопыту рэалізацыі інфармацыйна-адукацыйнага праекта «ШАГ» – «Школа Актыўнага Грамадзяніна» у ДУА «Дзяніскавіцкі яслі-сад – сярэдняя школа» Ганцавіцкіга раёна Брэсцкай, вобласці
9 клас

Тэма: “Антыфашысцкае супраціўленне на акупіраваных тэрыторыях”

У дзяржаўнай установе адукацыі “Дзяніскавіцкі яслі-сад – сярэдняя школа” працягваецца рэалізацыя інфармацыйна-адукацыйнага праекта “ШАГ”.

Вучань 9 класа разам з настаўнікам гісторыі Таццянай Іванаўнай Дзенісеня разгледзелі тэму “Антыфашысцкае супраціўленне на акупіраваных тэрыторыях”.

Традыцыйна інфармацыйная гадзіна была праведзена ў народным гісторыка-краязнаўчым музеі ўстановы адукацыі. Настаўнік разам з вучнем разгледзелі блок “Рух Супраціўлення”. Таццяна Іванаўна паведаміла, што барацьба супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у краінах Еўрапы атрымала назву руху Супраціўленне, мэта якога – супрацьстаянне германскаму акупацыйнаму рэжыму і аднаўленне нацыянальнай незалежнасці. У руху Супраціўленне удзельнічалі людзі розных сацыяльных слаёў і груп, палітычных і рэлігійных поглядаў, якія імкнуліся вызваліць тэрыторыю ад акупантаў.




У час абмеркавання блока “Партызанскі рух”, Таццяна Іванаўна звярнула ўвагу на дзейнасць легендарных партызанскіх атрадаў на тэрыторыі Беларусі, якія ўзначальвалі В. Корж, Т. Бумажкоў і Ф. Паўлоўскі. Настаўнік дадала, што акрамя дарослых людзей, у партызанскім руху актыўна удзельнічала і моладзь.




У час дыялогу вучань паведаміў, што наша піянерская дружына носіць імя Колі Гойшыка – піянера-героя, які быў партызанскім сувязным, узрываў нямецкія эшалоны са зброяй. 24 красавіка 1944 года Коля Гойшык загінуў, падарваўшы апошні ў сваім жыцці варожы цягнік. Памяць аб піянеры-героі захоўваецца ў сэрцах кожнага вучня і яго імя з гонарам носіць піянерская дружына.







У музеі ёсць экспазіцыя, прысвечаная партызанскаму руху на тэрыторыі вёскі Дзяніскавічы. Таццяна Іванаўна паведаміла аб партызанах, якія не здрадзілі Радзіме і сваім жыццём падаравалі нам мір.

Лаўрэнцьева І.П., намеснік дырэктара
па асноўнай дзейнасці ДУА “Дзяніскавіцкі яслі-сад – сярэдняя школа”